# КАНЦЭПТЫ Ў ПАРЭМІЯЛОГІІ НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЫЯЛЕКТНЫХ ПРЫКАЗАК В. АЗДАМІЧЫ СТОЛІНСКАГА РАЁНА

**І. Ю. Труханавец**

*УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна", Брэст, Рэспубліка Беларусь,* box@brsu.by

У гэтым артыкуле даследуецца праблема канцэптаў "Бог", "Радзіма", "Адносіны ў сям'і", "Маці", "Мужчына" у беларускай парэміялогіі на прыкладзе дыялектных прыказак.

***Ключавыя словы:*** канцэп; прыказка; парэміялогія; фразеалагічная адзінка.

# КОНЦЕПТЫ В ПАРЕМИОЛОГИИ НА ПРИМЕРЕ ДИАЛЕКТНЫХ ПОСЛОВИЦ Д. ОЗДАМИЧИ СТОЛИНСКОГО РАЙОНА

**И. Ю. Трухановец**

*УО "Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина", Брест, Республика Беларусь,* box@brsu.by

У гэтым артыкуле даследуецца праблема канцэптаў "Бог", "Радзіма", "Адносіны ў сям'і", "Маці", "Мужчына" у беларускай парэміялогіі на прыкладзе дыялектных прыказак. В этой статье исследуется проблема концептов "Бог", "Родина", "Отношения в семье", "Мать", "Мужчина" в белорусской паремиологии на примере диалектных пословиц

***Ключевыя слова:*** концепт; пословица; паремиология; фразеологическая единица.

Адносіны бацькоў і дзяцей – гэта важная тэма, адлюстраваная ў народнай мудрасці. Народ стварыў вялікую колькасць мудрых прыказак. У іх поўна і ярка адбілася духоўнае аблічча беларускага народа, яго гісторыя, лад, побыт, светапогляд. Большасць прыказак узнікла на аснове жыццёвых уражанняў і назіранняў. Прыказкай называюць кароткі выраз, у якім закладзены найглыбокі сэнс, досвед пакаленняў і мудрасць усяго народа. Кожная прыказка павучае чалавека, раіць, рэкамендуе далейшы план дзеянняў. Шырока прадстаўлена ў беларускіх прыказках тэма ўзаемаадносін у сям'і. мы разгледзім гэты канцэпт на аснове прыказак в. Аздамічы Столінскга раёна. Бацькоўскі аўтарытэт быў магутным фактарам у выхаванні. Напрыклад: – "*Нема тое лаўкі, шчоб продавала мамку" (маці гэто самы родны чоловек, екого трэба любыты, бо нема тое лаўкі,*

*шчоб продавала мамку). – "Пры сонцы цепло, пры мамцы – добро"(дзе б ты ні быў, помні, пры сонцы цепло, пры мамцы – добро)* .

Але, таксама, важна і прысутнасць дзяцей у хаце: – "*Добрэ хлебу за блінамі, добрэ бацьку за сынамі" (трэба, коб семья была веліка, бо добрэ хлебу за блінамі, добрэ бацьку за сынамі).* Мы бачым, што ў беларускіх прыказках падкрэсліваецца важнасць не толькі наяўнасці дзяцей у сям'і, але і правільнасць іх выхавання. Таксама прасочваецца праява клопату і любові да сваіх дзяцей. Маці і бацька – родныя людзі, якія бязмежна любяць сваё дзіця, якія нясуць адказнасць за яго выхаванне незалежна ад яго ўчынкаў, меркавання навакольных, стану яго здароўя. Заўсёды дзеці пераймаюць ад сваіх бацькоў пэўныя рысы характару, знешне падобныя да іх. Гэта добра выяўляецца на прыкладзе такіх прыказах, як: – "*Сова не родзіць сокола, да такого бы сама". – "От осінкі не родзяцца апельсінкі."(у ее характэр бы ў маці, мож кажуць людзі, от осінкі не родзяцца апельсінкі). – "Ека мамка така й лялька." – "Екі бацько, такі сын, екі молот, такі клін". – "Екіе самі, такіе й сані."*

Гэтыя прыказкі адлюстроўваюць складаныя і важныя аспекты ўзаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі, падкрэсліваючы значнасць выхавання, кахання і разумення.

Разгледзім яшчэ адзін канцэпт – аб значнасці выбару жонкі для мужчын беларускага народа, аб тым, якімі якасцямі, навыкамі ў побыце павінна валодаць добрая жонка, кажуць наступныя прыказкі: *– "Умела готоваці, ды не ўмела подаваці." – "Не та рыба, шчо ў рэцэ, а та,шчо ў руцэ." – "Не оцэньвай дзень зранку, а жонку змолоду." – "Сколько баба не скачы – усе одно дзеўкам слава".* Аднак можна сустрэць прыклады, якія ілюструюць і стаўленне дзяўчат-нявест да замужжы, іх уважлівы выбар выбранніка. Напрыклад: *– "Замуж выйці – не напасць, абы з мужэм не пропасць." – "Не знаўшы броду, не лезь у воду." – "Замуж выйці – трэба знаці: поздно легці – рано встаці." – "Быў бы мілы по душэ – прожывом і ў шалашэ."*

Прыказкі і прымаўкі аб значэнні выявы «мужчына» таксама знайшлі сваё адлюстраванне ў беларускай народнай творчасці. Прывядзём у прыклад прыказкі аб працавітасці і ляноце мужчын, а таксама прыказкі, якія падкрэсліваюць розум і кемлівасць мужчыны, яго жыццёвы шлях: – "*Старцом быўшы с перцом еўшы." – "Ек сіроце жэніцца то й ноч мала." – "Нелапленого пана й сем сёл не одзене." – "Ек родзілос целятко з лысінкой, то з лысінкой і помрэ." – "Як до чаркі – скоры, як до працы – хворы." – "Вырос до неба, а дурны як трэба." – "Голы як бізун, а остры як брытва." – "У неўмелого рукі не боляць." – "Дзе лодар ходзіць, там земля не родзіць".*

Яшчэ адзін важны канцэпт – узаемаадносіны мужа і жонкі ў сям’і, якія заўсёды былі складаныя. На аснове гэтага стэрэатыпу склалася мноства прыказак і прымавак аб сварках мужа і жонкі. Напрыклад: – “*Ек у хаці колоцяцца, то ў гумне (одрыні) не молоціцца.” – “Была ў свінкі семейка, да осталаса саменька.” – “Хата слаўна не вугламі, а пірогамі.”*

Спосабы канцэптуалізацыі рэчаіснасці ў кожнай мове і ўніверсальныя, і спецыфічныя. Мова не толькі адлюстроўвае культуру, але і фармуе чалавека, які ім карыстаецца. Людзі думаюць па-рознаму, таму што яны бачаць свет па-рознаму. Мова навязвае пэўнае бачанне свету. Праз словы, якія выказваюць паняцце гэтага месца, дзе мы нарадзіліся і жывем, і фармуюцца нацыянальны характар і менталітэт. Канцэпт “радзіма” адносіцца да важных лінгвакультурных канцэптаў моўнай карціны свету, з’яўляецца найбольш цікавым і ключавым паняццем. Разуменне патрыятызму, любові да радзімы для беларускага народа з’яўляецца практычна вядучым у парэміялогіі: – “*Сколько воўка ні кормі, вон на лег погледае.” – “Чужа ложка і рот дзерэ.” – “Дзе родзіўса, там і пригодзіўса.”*

Пачуццё прыхільнасці і любові да бацькоўскай хаты, да родных і блізкіх, да бліжэйшага асяроддзя заўсёды сутнасна звязана з “я-канцэпцыяй” індывіда, з яго ўяўленнямі пра сябе самога, пра сваю біяграфію, пра сваю будучыню і, акрамя ўсяго, з усведамленнем сябе ў якасці “чалавека дзеючага”: – “*У своёй хаці і ковеня маці.” – “Дома і сцены помагаюць.”*

Канцэпт “Бог” з’яўляецца адным з ключавых сімвалаў нацыянальнай парэміялогіі, мае доўгую гісторыю фарміравання і развіцця, пра што гаворыць яго багатая вербалізацыя ў мове, якая рэалізуецца ў вялікай колькасці парэмій, афарызмаў, фразеалагізмаў. Напрыклад: – “*Бог не загубіць, свіньня не з'есць.” – “Без Бога ні до порога.” – “Над сіротою Бог з калітою.” – “Ек робіць, то саменька, а ек есці, то, слава Богу, семейка.” – “Загадай дурню Богу моліцца, то лоб разобье.”*